# МАТЭРЫЯЛЬНАЯ КУЛЬТУРА ГАРАДОЎ БЕЛАРУСІ РАННЯГА НОВАГА ЧАСУ: АСАБЛІВАСЦІ СТАНАЎЛЕННЯ І РАЗВІЦЦЯ

*Д. У. Дук*

Новы час – адметная эпоха развіцця грамадства. Яна адзначаецца якаснымі зменамі ў сістэме ідэалагічных уяўленняў, значнымі навуковымі адкрыццямі і тэхнічнымі вынаходніцтвамі. Гістарычныя ўмовы, у якіх адбывалася фарміраванне новых каштоўнасных арыенціраў, на Беларусі мелі сваю спецыфіку. Адпраўной кропкай гэтага працэсу лічыцца надыход Рэнесанса.

Прапануемы ў дакладзе разгляд прысвечаны вывучэнню матэрыяльнай культуры гарадскога насельніцтва Беларусі XVI-XVIII ст. з пункту гледжання ўмоў, у якіх адбывалася станаўленне вытворчых і мастацкіх традыцый і іх увасабленне ў рэчах паўсядзённага быцця гараджан.

Матэрыяльная рэч як аб'ект даследавання ў археалогіі, утрымлівае два галоўных кампанента: матэрыял, з якога яна зроблена, і прызначэнне. Апошняе, як правіла, звязана з сістэмай ідэалагічных уяўленняў, якія характарызуюць сутнасць самой рэчы. Класічны прыклад -- кніга, носьбіт знакавай (пісьмовай) традыцыі, і ў той жа час аб'ект вывучэння матэрыяльнай культуры.

У традыцыйным грамадстве кожная рэч мусіла мець патаенны сэнс, яе семантыка была напрамую звязана з функцыянальным прызначэннем і была знаёма большасці карыстальнікам. З надыходам эпохі Рэнесанса пачынаецца паступовае разбурэнне традыцыйнага грамадства. У Вялікім княстве Літоўскім гэты працэс супадае з пашырэннем правоў шляхецтва і колькасным ростам пануючага саслоўя, адасабленне «эліты» ад «людзей простых». Горад паступова пераўтвараецца ў цэнтр субкультуры пэўных прафесійных груп. Гарадскія рамеснікі становяцца замкнёнай сацыяльнай адзінкай, што яскрава бачна на прыкладзе цэхавага ўладкавання, іх прадукцыя вырабляецца па замове шляхты і магнатаў, густы апошніх залежаць ад запатрабаванняў, найперш, еўрапейскай моды. Па вызначэнню Пітэра Бэрка, «сістэма цэхаў спрыяла стварэнню рамеснікамі і гандлярамі агульнай культуры, адрознай ад культуры сялян».

Паступовы адыход пануючага саслоўя ад звыклых каштоўнасных прыярытэтаў адлюстраваны ў рэчах матэрыяльнага быцця. Археалагічнае вывучэнне Беларусі мае больш чым двухсоттадовую гісторыю, аднак на матэрыялы XVI-XVIII ст. археолагі пачалі звяртаць належную ўвагу толькі ў апошнія гады. Раней лічылася, што гэтым павінны былі займацца этнографы. Вынікам такога падыходу сталася амаль поўная адсутнасць публікацый па гэтаму часу. Між тым агульнапрызнана, што менавіта ў эпо-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ху ранняга Новага часу афармляецца беларуская народнасць і паступова пачынаюць разгортвацца культурныя, эканамічныя і палітычныя працэсы, вынікі якіх уплываюць на сённяшнюю рэчаіснасць. Матэрыяльная культура – аб'ектыўная крыніца гісторыі грамадства. Задача археолагаў заключаецца ў назапашванні і сістэматызацыі дадзеных аб прычынах узнікнення, умовах і шляхах распаўсюджвання культурных і ідэйных плыняў у розных грамадскіх асяродках, узаемадзеянні гэтых асяродкаў на падставе вывучэння матэрыяльных (археалагічных) крыніц. Пісьмовымі крыніцамі «народная культура» (як гісторыя ановаў штодзённага быцця) згадваецца ў недастатковай ступені, у іх асноўная ўвага прысвечана палітычным падзеям, таму археалагічныя дадзеныя больш інфармацыйныя і ў вывучэнні побыту старажытнага насельніцтва рэчавыя крыніцы з'яўляюцца прыярытэтнымі.

Арнаментальныя матывы на рэчах канца XVI – пачатку XVII ст. маюць прыкметы, характэрныя для рубяжа эпох. Выразнае аздабленне стыля барока накладаецца на рэнесансныя матывы, зводзячы апошнія да схематызму, альбо пераўтвараючы іх у маньерыстычнай традыцыі. Маньерызм – гэта новы стыль еўрапейскага мастацтва, яшчэ не барока, але ўжо не Рэнесанс. У Польшчу і Вялікае княства Літоўскае гэты напрамак быў занесены ў сярэдзіне XVI ст. і традыцыйна звязваецца з контрэфармацыяй і Трайдэнскім саборам (1563 г.). У маньерызме Рэчы Паспалітай з 1570 г. выразна вылучаецца ўплыў з боку Нідэрландаў.

Тэрыторыя Вялікага княства Літоўскага ў межах 1582-1618 гг. прыкладна адпавядае сучаснай тэрыторыі Літвы і Беларусі. Менавіта Беларусь стала другой краінай у свеце пасля Італіі, якая прычынілася да развіцця стылю барока. Адбылося гэта ў архітэктуры: першым беларускім помнікам барока лічыцца касцёл Божага цела ў Нясвіжы (1593 г.). На мяжы XVI-XVII ст. шэраг культавых збудаванняў Беларусі адлюстроўвае інтэнсіўны пошук новых архітэктурных форм (Нясвіж, Мір, Камаі, Гародня, Ружаны, Слонім). Культавае мураванае дойлідства XVIII ст. звязана ўжо з традыцыямі Віленскага барока-самастойнай беларускай архітэктурнай школы.

Большасць гарадоў Беларусі ў XVI-XVII ст. паступова пераймалі заходнееўрапейскія ўзоры права і самакіравання па прыкладу, найперш, польскіх гарадоў. Аднак працэс фарміравання бюргерскага саслоўя ў Вялікім княстве Літоўскім так і не быў завершаны. Большасць жыхароў гарадоў і мястэчак заставаліся на палажэнні падобным да сялянаў і толькі ў буйных гарадах, асабліва каралеўскіх і некаторых магнатскіх, склаліся грамадскія і культурныя адносіны, падобныя да назіраемых у заходніх гарадах (Польшча, Прусія) і паўночных (Ліфляндыя, Курляндыя) суседаў Літвы і Беларусі. Гістарычныя ўмовы не маглі не сказацца на ступені развіцця матэрыяльнай культуры.

Адным з індыкатараў эканамічнага росквіту гарадоў з'яўляецца ступень развіцця грамадзянскай забудовы. У некаторых гарадах Беларусі

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

(Магілёў, Мінск) ў XVII ст. адзначаецца будаўніцтва мураваных камяніц-прэстыжнага жылля гарадскога патрыцыята. Фахверкавая забудова пераважала ў заходнім рэгіёне (Гродна, Брэст, Нясвіж, Клецк, Наваградак, Слонім). Віднае месца належыць будынкам ратуш, якія з'явіліся ў XV ст. з набыццём гарадамі Беларусі Магдэбургскага права.

Аднак у цэлым гарадская забудова заставалася па-ранейшаму пераважна драўлянай, і гэтая асаблівасць характэрна для ўсіх гарадоў Беларусі. На прыкладзе Полацка яскрава бачна, што склаўшаяся ў X-XIII ст. будаўнічая тэхніка за час існавання горада да XVIII ст. не адчула якіх-небудзь істотных зменаў. Памеры жылых дамоў ва ўсіх будаўнічых гарызонтах (раскопкі А.Р.Мітрафанава на Верхнім замку ў 1959 г.) былі прыкладна аднолькавыя: у сярэднім жылая плошча дамоў складала 27-28 кв. м. Тэхніка забудовы і плошча драўляных пабудоў у гарадах розных гістарычна-этнаграфічных рэгіёнаў вар'іравалася з неістотнымі адхіленнямі, што, ў цэлым, адлюстроўвае даволі трывалую з'яву.

Масавымі знаходкамі ў культурных пластах XVI-XVII ст. з'яўляюцца фрагменты посуду і пячная кафля, на іх долю выпадае асноўная колькасць археалагічнага матэрыяла. Кафлярства – прадстаўнічы від дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, было шырока прадстаўлена ў гарадах і мястэчках. Традыцыя вырабу кафлі на працягу некалькі стагоддзяў спазнала істотныя змены ад чыста утылітарных вырабаў (гаршковая кафля) да утылітарна-дэкаратыўных, прычым дэкор набыў першаснае значэнне, што міжволі вымушала рамеснікаў-кафляроў да актыўнай творчай дзейнасці. Печ у дамах заможных гараджан становіцца галоўнай часткай інтэр'еру, і толькі ў будынках гарадской беднаты па-ранейшаму карысталіся печамі-каменкамі. Але нават збяднелая частка гараджан старалася мець у сваіх дамах кафляныя печы з таннай гаршковай кафлі, пра што сведчаць знаходкі XVII ст. у Полацку.

У параўнанні з суседнімі тэрыторыямі Расіі і Польшчы беларускае кафлярства мела сваю спецыфіку. Існуе меркаванне, што традыцыя вытворчасці кафлі ўпершыню была пераняты палачанамі з нямецкіх земляў (1304 г.) і гэты працэс адбыўся раней чым у Польшчы. Росквіт вытворчасці паліхромнай кафлі прыпадае на канец XVI – 1-ю палову XVII ст. Каштавалі гэтыя вырабы нятанна, таму набыць іх маглі толькі заможныя феадалы і магнатэрыя. У XVII ст. руская культура ўзбагачаецца напрацоўкамі беларускіх майстроў з Вялікага княства Літоўскага. Беларускія рамеснікі шырока ўжывалі каляровыя палівы, менавіта яны азнаёмілі рускіх майстроў з прамавугольнай формай ліцавой пласціны кафлі. Аднак адбылося гэта ў выніку ваенных падзей 1654-1667 гг., у выніку якіх большасць гарадоў Вялікага княства Літоўскага страціла рамесны патэнцыял і некаторыя з іх (Полацк) больш не дасягнулі былога ўзроўню эканамічнага развіцця.

З сярэдзіны XVI ст. частка беларускага посуду (паліванага і невялікай колькасці непаліванага) была выраблена на нажным ганчарным крузе. У



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

гэты час ідзе актыўны пошук сыравіны для непаліваных вырабаў, прыдатнай для выцягвання на нажным ганчарным крузе і дастаткова жаростойкай. Матэрыялы XVI ст. дазваляюць сцвярджаць аб паслядоўным развіцці тэхналагічных прыёмаў цэнтральнаеўрапейскага ганчарства. Напрыклад, масавае ўкараненне тэхнікі «тачэння» посуду ў Польшчы прыпадае на сяр. XVI ст. Новыя прыёмы, абумоўленыя распаўсюджваннем нажнога круга, апярэджвалі развіццё маскоўскай керамічнай вытворчасці амаль на цэлае стагоддзе.

Аналіз зместу мытных кнігаў паказвае, што ў XVI-XVII ст. буйнымі гандлёвымі гарадамі былі Магілёў, Мсціслаў, Смаленск і інш., праз гэтыя цэнтры паступалі ўсходнія і заходнееўрапейскія тавары. Спажыўцоў цікавілі ў першую чаргу тавары, для вытворчасці якіх адсутнічала мясцовая сыравіна. Пад гэтую катэгорыю археалагічнага матэрыялу, знойдзенага пераважна ў замкавых комплексах заходняга рэгіёну (Гальшаны, Наваградак, Любча) і ў шэрагу гарадоў Беларусі, падпадае бытавая кераміка з белай (каалінітавай) гліны XVI – пачатку XVII ст. Паходжанне яе звязана з польскім горадам Ілжы. Аб'ядноўвае посуд гэтай групы арнамент у выглядзе карбоўкі – распаўсюджаны заходнееўрапейскі прыём аздаблення посуду. Другая група прывазнога начыння складае кераміка з «каменнай масы», пакрытай саляной палівай. Такі посуд паходзіць з керамічных майстэрняў на Рэйне. Асобная катэгорыя прывазнога керамічнага матэрыяла другой паловы XVIII ст. сведчыць аб пашырэнні гандлёвых сувязяў з Масквой.

Заўважана, што змены ў арганізацыі жыццёвай прасторы, г. зн. працэсы, якія непасрэдна вызначаюць прадмет археалогіі, сведчаць пра змену грамадскіх каштоўнасцяў. Яскравым прыкладам «індывідуалізацыі» пабытовай культуры служыць пашырэнне асартыменту рамеснай прадукцыі ганчароў і разнастайнасць відаў сталовага посуду. Асаблівае значэнне набывае эстэтыка. «Эстэтызм» матэрыяльнай культуры прасочваецца ў тэхніцы падпаліўнога ангобнага роспісу. Размаляваны посуд выконваў чыста дэкаратыўную функцыю. Самая прадстаўнічая калекцыя размаляваных талерак знойдзена ў Полацку (раскопкі Н.І. Здановіч), яна складае каля 30% з агульнай колькасці паліванага посуду XVI – 1-й паловы XVII стст. у адным раскопе.

Індывідуалізацыя народнага мастацтва праяўляецца ў разнастайнасці дэкаратыўных матываў пячной кафлі, прычым некаторыя рэчы выконваліся па канкрэтнай замове згодна з густам уладальніка. У XVII ст. кафля з выявамі геральдычнага зместу ўтварае асобную групу, пры гэтым пераважаюць выявы радавых шляхецкіх гербаў. Знакавая інфармацыя, закладзеная на гербавай пласціне, была даступна толькі ўладальніку герба і колу яго набліжаных у параўнанні, напрыклад, з міфалагічнай, альбо сюжэтнай тэматыкай, якая была зразумела і вядома большасці.

Напрыканцы разглядаемага перыяда (2-я палова XVIII ст.) завяршаецца вылучэнне элітарнай культуры. Па вызначэнню П. Бэрка, з часу Рэне-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

санса «народная культура» была культурай кожнага: «другой культурай для адукаванай часткі грамадства і адзінай культурай для астатніх». Сярэдняе саслоўе (шляхта) арыентуецца на «элітарную» культуру магнатаў, але хуткае змяненне «народнай культуры» было немагчыма з-за адсутнасці ў гэты час дастатковай арганізацыйнай і эканамічнай асновы.

У якасці прыклада існавання «элітарнай» субкультуры можна прывесці палацавыя комплексы цэнтральнай і заходняй Беларусі. Гэтыя комплексы – спалучэнне феадальнай сядзібы з прыватнаўласніцкім паселішчам – тыповыя для заходняй Беларусі (Мір, Нясвіж, Любча, Гальшаны і інш.). У сядзібах феадалаў дарагія рэчы ўжываліся значна шырэй, чым у дамах местачкоўцаў. Замкавыя комплексы ўтрымліваюць шмат імпартнага керамічнага і шклянога посуду XVI – пачатку XVII ст., ў іх адзначаецца шырокае ўжыванне паліванай керамікі і паліхромнай кафлі, сталовых прыбораў на ўзор еўрапейскіх, фіксуецца разнастайнасць арнаменту на звычайных пабытовых рэчах. Як слушна заўважыў А.К. Краўцэвіч, «ішоў працэс безупыннага ўзаемадзеяння паміж двума слаямі адной сярэднявечнай культуры..., культура пануючага класа разам з тым з'яўлялася крыніцай, носьбітам еўрапейскіх навацый, якія паступова засвойваліся і перапрацоўваліся ў адпаведнасці з народнымі традыцыямі і маёмаснымі магчымасцямі». Праз феадальныя і дзяржаўныя цэнтры адбывалася станаўленне новых мастацкіх плыняў. Партрэтныя калекцыі ўзнікаюць у палацах Радзівілаў, Сапегаў і інш., барочная скульптура ўпрыгожвае інтэр'еры і экстэр'еры, з'яўляюцца надмагіллі, творы станкавага і манументальнага мастацтва.

Розніца паміж распаўсюджваннем барокавай традыцыі (магчыма, італьянскай) у кафлярстве Віленскага ніжняга замка і вырабамі майстроўкафляроў іншых гарадоў Вялікага княства Літоўскага – толькі ў прадстаўнічасці калекцыі (бо віленскімі заказчыкамі былі першыя асобы Рэчы Паспалітай). Безумоўна, віленская школа кафлярства, як узорная, паўплывала на развіццё дэкаратыўнага мастацтва ва ўсёй краіне, сталася творчым асяродкам для рамеснікаў многіх прафесій, але самастойныя рамесныя школы існавалі ў кожным горадзе і нават у мястэчках Вялікага княства Літоўскага. Сведчанне гэтага – археалагічныя адкрыцці апошніх дзесяцігоддзяў.

Вялікае княства Літоўскае, як поліканфесійная і поліэтнічная краіна, у XVI-XVIII ст. апынулася не ў самых спрыяльных геапалітычных умовах. Гэтым тлумачыцца той факт, што распаўсюджванне творчых здабыткаў беларускіх майстроў у Расіі адбывалася, з большае, гвалтоўным шляхам у выніках войн 1558-1582, 1654-1667, 1700-1721 гг. Застаўшыся без рамеснага патэнцыялу, многія гарады страчвалі сваю эканамічную ролю і зыходзілі на другі план. Гэтым тлумачыцца заняпад палітычнай ролі Полацка пасля Інфлянцкай вайны, узвышэнне Магілёва ў XVII ст. перапыняецца ў выніку Паўночнай вайны.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Тым не менш, у агульных рысах матэрыяльная культура працягвала развівацца па агульнаеўрапейскай мадэлі. Пераймаючы лепшыя дасягненні заходнееўрапейскіх майстроў, беларускія рамеснікі стварылі асновы для станаўлення ўласнай традыцыі. Ініцыятарам выступалі прадстаўнікі вышэйшага саслоўя, майстры-выканаўцы ўдала спалучалі ўласныя здабыткі з запатрабаваннямі моды і самі, такім чынам, станавіліся праваднікамі самастойных напрацовак. Так былі створаны знакамітыя беларускія школы паліхромнай кафлі і разьбы па дрэву, лепшыя творы якіх увасобіліся ў іканастасе Каломенскага палаца, Смаленскім саборы, Нова-Ерусалімскім храме і інш.

Аднак у аснове сваёй матэрыяльная культура гарадоў Беларусі XVI-XVIII ст. заставалася ўсходнеславянскай, што яскрава бачна на прыкладзе грамадзянскай забудовы. Два палюсы – кансерватызм развіцця масавай гарадской (пераважна драўлянай) забудовы і схільнасць да культурных інавацый у рэчах пабытовай культуры – вызначаюць адметнасць развіцця матэрыяльнай культуры беларускіх гарадоў. І хаця у час існавання Вялікага княства Літоўскага Беларусь уваходзіла ў арэал распаўсюджвання заходнееўрапейскай культуры, гістарычныя рэаліі канца XVIII – пачатку XIX ст. перапыняюць гэты працэс.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова